# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ СУДОВАЙ РЭФОРМЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў XVI ст.

**Ю. П. Доўнар**

Гісторыя судовых рэформаў на Беларусі заўсёды будзе актуальнай тэмай для даследаванняў, тым больш што навуковых працаў па гэтай праблематыцы вельмі мала. Нават самі словазлучэнні «прававая рэформа» і «судовая рэформа» да нядаўняга часу амаль не выкарыстоўваліся навукоўцамі, хаця пра кадыфікацыю заканадаўства ў XVI стагоддзі. і ўвядзенне ў дзеянне агульнадзяржаўных зводаў законаў – Статутаў 1529, 1566, 1588 гадоў – пісалася шмат (аднак далека не дастаткова!).

Закраналі праблемы дзейнасці судовай сістэмы Вялікага княства Літоўскага вучоныя дарэвалюцыйнага перыяду (М.К. Любаўскі [12], Ф.І. Леантовіч [11] і інш.). Размова ў іх працах ішла пра такія важныя этапы судовай рэформы, як увядзенне ў дзеянне гродскіх, земскіх і падкаморскіх судоў, Галоўнага Літоўскага Трыбунала, а таксама аб пытаннях працэсуальнага права А. Каравіцкі [18] і К. Малышаў [13].

Найбольш поўна и дэталёва пісаў аб шэрагу судовых устаноў Вялікага княства Літоўскага дарэвалюцыйны гісторык права, прафесар І. І. Лапо [8; 9; 10], чые даследаванні тычыліся дзейнасці гродскіх, земскіх і падкаморскіх судоў. Ён падрабязна раскрыў парадак фарміравання гэтых устаноў, іх склад і кампетэнцыю, закрануў пытанні стадый грамадзянскага і крымінальнага працэсу, выканання судовых пастаноў. Працы гэтага даследчыка былі напісаны на падставе дэталёвага вывучэння крыніц права і дакументальнага матэрыялу. Пры гэтым І. І. Лапо аналізаваў дзейнасць судоў у іх гістарычным развіцці, пачынаючы з моманту ўтварэння.

Вялікая заслуга ў асвятленні шматлікіх пытанняў беларускай гісторыі належыць знакамітаму беларускаму вучонаму М.В. Доўнар-Запольскаму, які закранаў і праблему судовай улады ў Вялікім княстве Літоўскім. Ён амаль першы, хто назваў пераўтварэнні ў судовым ладзе і судаводстве XVI стагоддзя менавіта рэформай. Важна, што ў яго кнізе «Гісторыя Беларусі», выдадзенай у 1994 годзе, ёсць маленькі параграф у дзве старонкі, які называецца «Судовая рэформа» [3, с. 136–137]. Пры гэтым цікава не толькі тое, што ён заўважыў працэс судовага рэфармавання і прысвяціў яму цэлы параграф (бо гэта пытанне закраналі вучоныя і раней), але і тое, што дадзеная кніга, напісаная ў

20-я гады XX стагоддзя, была забаронена да друку і пабачыла свет толькі пасля атрымання Беларуссю незалежнасці.

У пачатковы савецкі перыяд пытанні гісторыі судовай улады на Беларусі амаль не закраналіся. Выключэннем з’яўляюцца працы навукоўцаў перыяду т.зв. беларусізацыі. Так, трэба адзначыць ролю ў беларускай гістарыяграфіі У.І. Пічэты – першага рэктара БДУ, які шмат увагі надаваў праблемам гісторыі Беларусі [напрыклад, 14], а таксама яго вучня – В. Дружчыца, які ў сваіх працах, прысвечаных увядзенню магдэбургскага права на Беларусі, непасрэдна закранаў праблему судовай улады [напрыклад, 6]. Пазней гэтую праблему асвятлялі беларускія вучоныя-гісторыкі, якія пісалі навуковыя працы пра гарады Беларусі і становішча насельніцтва (З. Капыскі [7], А. Грыцкевіч [2] і інш.).

Трэба з задавальненнем адзначыць, што ў апошні перыяд беларускія вучоныя-правазнаўцы пачалі актыўна распрацоўваць праблему судовай улады на Беларусі ў дакастрычніцкі перыяд. Пра гэта сведчаць кнігі і артыкулы А.Ф. Вішнеўскага [1; інш.], Т.І. Доўнар (шэраг яе навуковых артыкулаў прысвечаны непасрэдна судовай сістэме і судовым рэформам на Беларусі [4; 5; інш.]), С.Ф. Сокала [15], Я.А. Юхо [16; 17; інш.]. Так, прафесар Я.А. Юхо на падставе вывучэння Статутаў 1529, 1566, 1588 гадоў вылучыў новыя прагрэсіўныя прынцыпы судовага ладу і судаводства на Беларусі ў феадальны перыяд, падкрэсліў, што апошні Статут (1588) прасякнуты ідэяй прававой дзяржавы і, па сутнасці, з'яўляецца феадальнай канстытуцыяй.

Нельга не дадаць, што польскія вучоныя (у мінулыя часы і зараз) пры даследаванні гісторыі айчыннага права і судовага ладу закранаюць аналагічныя пытанні адносна Вялікага княства Літоўскага [19; 20; 21; інш.]. Актыўна пачалі працаваць у гэтым накірунку і літоўскія даследчыкі, аднак, на жаль, у асноўным яны пішуць працы па-літоўску, без перакладу на якую-небудзь еўрапейскую мову [напрыклад, 22].

Увогуле ж да гэтага часу непасрэдна праблема гісторыі судовых рэформаў на Беларусі застаецца далёкай ад поўнага асвятлення, тым больш гэта тычыцца судовай рэформы XVI стагоддзя. Між тым для дасягнення найбольшай эфектыўнасці пры сучасным рэфармаванні сістэмы судоў патрабуецца прымяненне гістарычнага і кампаратыўнага падыходаў.

## Літаратура


1. *Вішнеўскі А.Ф.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (IX–XX ст.). Мн., 1998. 205 с.
2. *Грицкевич А.П.* Социально-экономическое развитие частновладельческого города Белоруссии в XVI–XVIII вв. (по материалам Слуцка): Автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02. // АН БССР. Ин-т ист. Мн.: Навука і тэхніка, 1963. 20 с.
3. *Доўнар-Запольскі М.В.* Гісторыя Беларусі. Мн., 1994. 510 с.
4. *Довнар Т.И.* Судебная реформа в Великом княжестве Литовском и Статут 1566 года /Литовский Статут 1566. Вильнюс, 1994. С. 28–37.
5. *Доўнар Т.І.* «судов і справ своих отступили и выреклись…» // Судовы веснік. 1992. № 2; *Доўнар Т.І.* Суды феадальнай Беларусі // Судовы веснік. 1992. №1. С. 54–57.
6. *Дружчыц В.* Войты і іх улада ў беларускіх гаспадарчых местах з Майдэборскім правам // Інбелкульт. Запіскі аддзелу гуманітарных навук. Працы клясы гісторыі. 1929. Кн.8. Т.3. С. 241–298.
7. *Копысский З.* Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII ст. Мн., 1975. 192 с.
8. *Лаппо И.* Гродский суд в Великом княжестве Литовском в XVI столетии // ЖМНП. 1908. Ч. 13, янв. С. 51–113.
9. *Лаппо И.И.* Земский суд в Великом княжестве Литовском в конце XVI века // Журнал министерства народного просвещения. Седьмое десятилетие.1897. № 6. С. 263– 302.
10. *Лаппо И.И.* Подкоморский суд в Великом княжестве Литовском в конце XVI–начале XVII века // Журнал министерства народного просвещения.1899. №8. С. 341–403.
11. *Леонтович Ф.И.* Суд господарей и их советников в Великом княжестве Литовском до и после Люблинской унии // Журнал Министерства юстиции. 1910. № 2. С. 30–52.
12. *Любаўскі М.* Літоўска-Беларуская дзяржава ў пачатку XVI сталецця // Чатырохсотлецце бел. друку. 1926. С. 75.
13. *Малышев К.* Курс гражданского судопроизводства. Т.1. М., 1876. С. 14–21.
14. *Пичета В.И.* Белоруссия и Литва XV–XVI вв. (Исследования по истории социально-экономического, политического и культурного развития). М.: Изд. АН БССР, 1961. 815 с.
15. *Сокол С.Ф.* Политическая и правовая мысль в Белоруссии XVI – первой половины XVII в. / Науч. ред. И.А. Юхо. Мн.: Навука і тэхніка, 1984. 188 с.
16. *Юхо И.А.* Правовое положение населения Белоруссии в XVI веке. Мн., 1978. 114 с.
17. *Юхо Я.А.* Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мн., 1992. 270 с.
18. *Korowicki A.* Proces cywilny litewski. Wilno, 1826. 148 s.
19. *Kutrzeba S.* Dawne polskie prawo sądowe. Lwów, 1927. 76 s.
20. *Naworski Z.* Prawo karne i proces Polski przedrozbiorowej. Toruń, 1993. 285 s.
21. *Raudeliunas V., Wisner H.* Z dziejów Trybunału Wielkiego Księstwa Litewskiego 1581–1648 // Kwartalnik Historyczny. T. LXXXIII. JN. 4. S.64–72.
22. *Sabunas L.* Didiosos Lietuvos Kunigaikstystes Ido Tribunolas (1613–1764). Kaunas, 1936. 153 s.